# Літаратура эпохі Сярэднявечча



# Эпоха Сярэднявечча



## Гістарычныя звесткі:

Ранняе Сярэднявечча (да 1000 г.) уражвае глабальнымі гістарычнымі зрухамі; з іх, магчыма, галоўны — Вялікае перасяленне народаў з Азіі ў Еўропу (готы, гуны, цюркі, балгары, арабы, венгры). Не менш важным было фарміраванне вялікіх імперый на Захадзе і на Усходзе (Візантыя, Свяшчэнная Рымская імперыя, імперыя Карла Вялікага, Хазарскі каганат, Арабскі Халіфат, імперыя Тан у Кітаі). Ранняе Сярэднявечча — гэта таксама і эпоха фарміравання сусветных рэлігій і іх распаўсюджання па свеце. Асабліва важнае значэнне для далейшага лёсу цывілізацыі мела канчатковае станаўленне хрысціянства і ўзнікненне іслама. Найбольш магутнай імперыяй Ранняга Сярэднявечча была Візантыя.Падрабязней на:http://resheba.com/gdz/literatura/9-klass/ragojsha/4

Позняе Сярэднявечча. 1000 год – своеасаблівая мяжа ў гісторыі. Усе хрысціяне чакалі канца свету [Асабіста я лічу, што страх перад канцом вымусіў і **Уладзіміра Хрысціцеля** прыняць хрысціянства]. Панавалі змрочныя, апакаліптычныя настроі. Але канца свету не адбылося. Падняўся дух людзей. На хвалі аптымізму пачаўся рост гарадоў, матэрыяльнай вытворчасці, рамяства, гандлю. Ужоз XIII ст. можна гаварыць пра перадрэнесансныя тэндэнцыі. Да 1000 года закончылася іВялікае перасяленне народаў з Азіі ў Еўропу: апошнімі прыйшлі венгры, захапіўшы славянскую тэрыторыю. Надышоўчас збірацькамяні, як гаворыцца ў Бібліі.Пасля 1000 года ідзе бурнае афармленне феадальных манархій і аб’яднанне Заходняй Еўропы пад уладай Пап. Папы ўзначалілі і экспансію еўрапейскага феадалізму на Усход; два стагоддзі будуць працягвацца крыжацкія паходы. Гэта было імкненне Еўропы ўзяць рэванш над Азіяй, адкуль на працягу тысячы гадоў ішлі пастаянныя хвалі перасяленцаў-захопнікаў. Адваяванне труны ***Хрыста*** ад «няверных»-мусульман – не адзіная падстава для еўрапейскіх рыцараў. Даследчыкі-гісторыкі ўказваюць на эканамічныя прычыны крыжацкіх паходаў у Палесціну, а пазней на славянскія землі: наяўнасць лішніх людзей у феадальных сем’ях – малодшых сыноў, якія, не маючы маёмасці, вымушаны былі шукаць багацця і прыгод у чужых краінах. Але я лічу, што падставы – больш складаныя, у тым ліку і глыбока містычныя – для саміх рыцараў, а ў агульным плане – метагістарычныя.

У час крыжацкіх паходаў у Заходняй Еўропе памяняўся архітэктурны стыль – з раманскага на *готыку*. Будуюцца такія велічныя саборы, якія і сёння вызначаюць воблік шмат якіх еўрапейскіх гарадоў, напрыклад, Сабор Парыжскай Божай Маці, Шартскі сабор (таксама ў Францыі), Кёльнскі сабор у Германіі, сабор Святога Віта ў Празе, сабор Святой Ганны ў Вільні.

# Кіеўская Русь



Акрамя Візантыі, якая раскінулася на землях і Еўропы і Азіі, самай вялікай краінай у Еўропе з'яўлялася ў ХІ ст. Кіеўская Русь. Назва спрэчная, але яна ўкаранілася ў рускіх, украінскіх і многіх еўрапейскіх даследаваннях, і з ёю можна згадзіцца як з назвай умоўнай, маючы на ўвазе не столькі дзяржаўнае, колькі духоўнае адзінства ўсходніх славян (у дзяржаўным плане гэта было такое ж аморфнае стварэнне, як цяперашняе СНД). Чаму Кіеўская Русь, а не Наўгародская, Полацкая, Чарнігаўская? Падстаў для ўзвышэння Кіева шмат: скажам, яго старажытнасць, роўная Рыму, сёння ўжо даказаная археолагамі (Праўда, і Полацк – такі ж старажытны, але яму не хапіла энергіі для аб'яднання вакол сябе вялікай тэрыторыі, хоць ён і з'яўляецца цэнтрам Еўропы). Адной з прычын быў і водны шлях, які называўся «з варагаў у грэкі», а на самай справе – «з грэкаў у варагі», бо менавіта купцы-грэкі здаўна праклалі яго па Дняпры, а пасля і Заходняй Дзвіне, да сыравіны нашых зямель. Грэкі везлі з сабою сваю культуру, а культура гэтая – праз Візантыю – не толькі грэцкай і рымскай Антычнасці, але і Усходу. Устойлівы гандаль патрабаваў адзінай улады ва ўсіх гарадах уздоўж асноўнага шляху – вось патрэба, якая нарадзіла Кіеўскую Русь. Апорныя пункты ўздоўж гэтага шляху – Кіеў, Полацк, Ноўгарад – пастаянна змагаліся паміж сабою за ўладаранне над усёй тэрыторыяй усходніхславян. Безумоўна, працэсы адбываліся складаныя і неваўсім канчаткова вывучаныя. Ішоў, сапраўды, і адваротны рух: з поўначы на поўдзень. У Нарвегіі і Даніі былі "лішнія" людзі, якія пад назвай "варагаў", або "русі", плылі на поўдзень служыць ва ўсходніх імперыях у войску. Вось чаму шлях – "з варагаў у грэкі». Сёння яго адnаўляюць для турызму.











# Біблія. Структура Біблії.




**Біблія** падзяляецца на дзве часткі — **Стары запавет і Новы запавет.** «Запавет» азначае «дамова», «саюз». Саюз быў заключаны Богам з людзьмі. Па гэтай дамове людзі павінны былі жыць паводле запаведзяў, а Бог клападідца пра людзей. Стары запавет ўключае Пяцікніжжа Майсея, кнігі прарокаў і Пісанні. Новы запавет складаецца з чатырох Евангелляў (ад Мацея, Лукі, Марка, Іаана), а таксама Апостала і Апакаліпсіса.
Падрабязней на:http://resheba.com/gdz/literatura/9-klass/ragojsha/4

# Кніга Кніг –

**звод шматлікіх тэкстаў, напісаных выбранымі Богам шматлікімі людзьмі**

**Стары Запавет** — збор розных па памеры і па сваім змесце твораў. Скразная іх ідэя — запавет (дамоўленасць) паміж Богам і народам, а галоўная тэма — гісторыя яўрэйскага народа. На гэтым матэрыяле пастаўлена мноства агульначалавечых праблем: сэнс чалавечага жыцця, асноўныя чалавечыя дабрачыннасці, грэх і інш. Новы Запавет з'явіўся працягам Старога, але яго змест — дамоўленасць Бога ўжо не з адным народам, а з усім чалавецтвам.
Склад **Новага Запавету** — 27 твораў: 4 Евангеллі (па-грэчаску «Добрая Вестка»), «Апостал» («Справы апосталаў»), 21 пасланне, «Апакаліпсіс» («Адкрыццё Іаана Багаслова») — Казань1 пра канец свету, пра апошні двубой Дабра і зла. Самае важнае ў Новым Запавеце — Евангеллі: паводле Мацвея, Лукі, Марка і Іаана (ён жа аўтар «Апакаліпсісу»).
Падрабязней на:http://resheba.com/gdz/literatura/9-klass/ragojsha/4

# ПЫТАННІ:

1. З якой гістарычнай падзеі пачынаецца эпоха Сярэднявечча?

2. Якія асноўныя працэсы адбываліся ў эпоху Ранняга і Позняга Сярэднявечча?

3. Чаму вызначальнай датай у Сярэднявеччы лічыцца 1000 год?

4. Што вы ведаеце пра Кіеўскую Русь?

5. Раскрыйце структуру Бібліі.

6. Чым адрозніваецца Новы Запавет ад Старога Запавету?

7. Што вы можаце сказаць пра кожнага са стваральнікаў Евангелляў?

